# Заклад

***Рыгор Сітніца***

У беларускай мове юрыдычны тэрмін „*заклад*" згадваецца яшчэ ў Статуце Вялікага Княства Літоўскага. Шматлікія захопніцкія навалы, што не міналі нашага краю, надалі гэтаму слову зусім іншы сэнс, трывала замацаваўшы ў беларускай сьвядомасьці слова „*закладнік*".

Ісьці ў *заклад*, купіць на *заклад*, аддаць у *заклад*, *закладваць* нейкую справу. Тут дарэчы будзе згадаць і сьвята *Закладзіны*, калі, заклаўшы першы камень у падмурак, дужа натомленыя работнікі пачыналі імпэтна „*закладаць за каўнер*".

Апроч іншага, не дае пра сябе забыць і пасьпяховая *закладка* калгасамі фуражу, пра што рэгулярна інфармуе сваіх слухачоў беларускае савецкае радыё.

Можна было б прыгадаць яшчэ нешта, але ўсе гэтыя *заклады* трацяць амаль усялякі сэнс перад тым значэньнем, якое займела гэтае слова ў краіне саветаў.

*Закладваючы* ўласнага бацьку, можна было лёгка выйсьці ў піянэры-героі, як гэта зрабіў славуты Паўлік Марозаў, стаўшы прыкладам для кожнага савецкага дзіцяці. *Заклаўшы* суседа, шмат хто здолеў спатоліць уласную зайздрасьць ці адквітаць нейкую крыўду. Варта пачаць *закладваць* начальніка, каб куды бліжэйшаю зрабілася таемна жаданая пасада. *Закладваючы* з пэўнай рэгулярнасьцю, чалавек набываў шанец зрабіць сваю прыродную схільнасьць хлебнаю прафэсіяй у штаце адпаведнай установы.

Аднак, якой бы ўдалай ні аказалася гэтая кар'ера, яна проста нішто ў параўнаньні з мажлівасьцю аддаць у *заклад* дзеля ўласнага інтэрасу цэлую краіну, тым самым зрабіўшы *закладнікамі* ажно 10 мільёнаў чалавек.

# Заўзятар

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

*Заўзятар.* Гэтае слова зьявілася ў беларускай мове ў першай палове 80-ых, калі нацыянальна сьведамая моладзь пайшла на стадыёны. Ужыванае перад тым пазычанае з расейскай *балельшчык* аніяк ня лезла ў сыстэму мовы і вымагала як найхутчэйшай замены. Вось тады два паэты — Алег Бембель і Алесь Разанаў — прапанавалі *заўзятара.* Пры гэтым сама зьява *заўзятарства* была падзеленая на тры катэгорыі:

1. *Заўзятар* — той, хто арыентуецца ў спорце, чытае адмысловыя выданьні, ведае лічбы й імёны, карацей — аматар прафэсійнага ўзроўню.

2. *Заўзей* — той, хто ходзіць на стадыёны, ведае, што адбываецца ў спорце, але ў адрозьненьне ад *заўзятара* ён вылучна аматар.

3. *Заўзюк* — самая калярытная і небясьпечная постаць на трыбунах. Ён мала ў чым арыентуецца, почасту зьяўляецца на спаборніцтвы нападпітку. Гэта ён, *заўзюк*, роспачна вые, калі ягоная каманда прайграе, і дзіка трыюмфуе, калі наадварот. Яго лёгка можна пазнаць на трыбуне па адкаркаванай бутэльцы і кавалку кілбасы.

Гэты падзел на катэгорыі, як і слова *заўзець* (балець), у мове пакуль што не прыжыліся.